# Беларуская мова

## ДЛЯ ЎСТАНОЎ АДУКАЦЫІ З БЕЛАРУСКАЙ МОВАЙ НАВУЧАННЯ І ВЫХАВАННЯ

### І КЛАС

#### Кантрольнае спісванне

**Вясна**

Наступіла вясна. Прыгрэла ласкавае сонейка. Пабеглі першыя раўчукі з прыгоркаў. Дзеці рады цёпламу надвор'ю. Яны назіраюць за раўчукамі. (19 слоў)

**Вавёрка**

У парку Маша ўбачыла вавёрку. Звярок скакаў па галінках. Раптам вавёрка прысела. Яна трымала ў пярэдніх лапках шышку. (19 слоў)

*Паводле У. Ліпскага*

**Гаспадыні**

У Соні ёсць сястра Аліса. Кожную нядзелю раніцай яны гатуюць. Сёння дзяўчынкі зрабілі варэнікі з тварагом. Мама будзе рада! (20 слоў)

### ІІ КЛАС

#### Кантрольны дыктант

**Памочніца**

Маша і дзед вярталіся з лесу. Першы раз у жыцці дзяўчынка збірала грыбы. Дзед даверыў ёй ножык. Маша сама зразала сыраежкі і падбярозавікі. Дзед задаволены.(!) У яго з'явілася памочніца. Маша несла дамоў поўнае вядро грыбоў. (36 слоў)

*Паводле У. Ліпскага*

**У лесе**

Дзед з унукамі прыйшлі ў лес. Бярозкі на ўзлеску прыветліва ківаюць лісткамі. У небе спяваюць жаўрукі. Радасна цінькаюць сінічкі. Высока на сасне стукае дзюбай дзяцел. З вяршаліны елкі нясецца ціхае буркаванне дзікага голуба. Хораша ў лесе! (38 слоў)

*Паводле В. Гурскага*

Запісаць на дошцы слова *прыйшлі*.

**Машына цыбуля**

Было гэта вясной. Маша пасадзіла цыбуліну ў слоік з вадой. Дзяўчынка паставіла яе за фіранку на акне. Цыбуліна вырасла. Са слоіка тырчалі зялёныя пёркі.

Маша вырашыла ўсіх пачаставаць цыбуляй. Вочы ў дзяўчынкі пераможна зіхацелі. Сама вырасціла! (38 слоў)

*Паводле У. Ліпскага*

## ДЛЯ ЎСТАНОЎ АДУКАЦЫІ З РУСКАЙ МОВАЙ НАВУЧАННЯ І ВЫХАВАННЯ

### ІІ КЛАС

#### Кантрольны дыктант

**Веснавыя грыбы**

Ці можна знайсці грыбы вясной? Смела ідзіце ў лес.(!) Вясной з'яўляюцца смаржкі. Ножка ў гэтых грыбоў кароценькая. Шапка карычневага колеру. Яна ўся маршчыністая. (25 слоў)

Запісаць на дошцы слова *смаржкі*.

**Вясной**

Раніцай Паўлік выйшаў на вуліцу і абрадаваўся. Пасвятлелі воблакі на небе. Прыгравае веснавое сонейка. Лёгкі ветрык лашчыць твар. Пабеглі з прыгоркаў звонкія ручайкі. Як хораша вясной! (27 слоў)

*Паводле В. Ткачова*

Запісаць на дошцы слова *выйшаў*.

**Пугач**

Пугач — самая вялікая сава. На круглай галаве ў птушкі тырчаць пярынкі. Яны нагадваюць рожкі. У савы вялізныя жоўтыя вочы і загнутая дзюба. Яны надаюць пугачу грозны выгляд. (28 слоў)

*Паводле У. Ягоўдзіка*

Паведаміць пра пастаноўку працяжніка.

## ДЛЯ ЎСТАНОЎ АДУКАЦЫІ З БЕЛАРУСКАЙ І РУСКАЙ МОВАМІ НАВУЧАННЯ І ВЫХАВАННЯ

### ІІІ КЛАС

#### Кантрольны дыктант з граматычным заданнем

**Пліска**

Дзядуля і Максімка збіралі ў садзе парэчкі. Вялікі куст быў густа абсыпаны ягадамі. Раптам на

яблыні трывожна заспявала пліска. Чаму птушачка так замітусілася? Дзядуля адхінуў галінкі куста. Максімка ўбачыў гняздо і маленькіх птушанятак. Яны выцягвалі шыйкі і спалохана глядзелі на людзей. Максімка і дзядуля вырашылі сабраць ягады пазней. (49 слоў)

*Паводле В. Ткачова*

***Граматычнае заданне***

1. Выпішыце з тэксту словы, супрацьлеглыя па значэнні прапанаваным.

*I варыянт:* малы, рэдка.

*II варыянт:* спакойна, захінуў.

2. Разбярыце слова па саставе.

*I варыянт:* галінкі.

*II варыянт:* Максімка.

3. Падкрэсліце галоўныя члены сказа.

*I варыянт:* Раптам на яблыні трывожна заспявала пліска.

*II варыянт:* Максімка ўбачыў гняздо і маленькіх птушанятак.

**Снеданне**

Ульяна прыехала да бабулі ў вёску. Старая завіхалася каля печы. Яна гатавала снеданне. Спачатку бабуля выцягнула з печы патэльню з яечняй. Потым на стале з'явіўся чыгун з бульбай. Мама прынесла агуркі і цыбулю. Ульяна дапамагла зрабіць салату. Дзяўчынка пакрышыла агуркі. Сям'я з ахвотай паснедала! (45 слоў)

*Паводле В. Гурскага*

***Граматычнае заданне***

1. Выпішыце з тэксту аднакаранёвыя словы да прапанаваных. Абазначце ў іх корань.

*I варыянт:* бульбяны.

*II варыянт:* вясковы.

2. Вызначце лік і род назоўнікаў у сказе.

*I варыянт:* Ульяна прыехала да бабулі ў вёску.

*II варыянт:* Потым на стале з'явіўся чыгун з бульбай.

3. Падкрэсліце галоўныя члены сказа.

*I варыянт:* Мама прынесла агуркі і цыбулю.

*II варыянт:* Ульяна прыехала да бабулі ў вёску.

**Вартаўнікі раслін**

Божыя кароўкі прыносяць людзям шмат карысці. Яны пільна ахоўваюць нашы сады ад шкоднікаў. Летам лісце пладовых і ягадных дрэў пакрываецца тлёй. Гэтыя насякомыя высмоктваюць з лісця сокі. І дрэвы могуць загінуць.(!) Божыя кароўкі з тлёй хутка расправіляюцца. Таму божыя кароўкі — сапраўдныя вартаўнікі раслін.(!) (45 слоў)

*Па матэрыялах кнігі "Таямніцы Дзеда Усяведа"*

Паведаміць пра пастаноўку працяжніка.

***Граматычнае заданне***

1. Выпішыце з тэксту сінонімы да прапанаваных слоў.

*I варыянт:* многа.

*II варыянт:* старанна.

2. Знайдзіце ў сказе дзеяслоў, вызначце яго лік і час.

*I варыянт:*

Божыя кароўкі прыносяць людзям шмат карысці.

*II варыянт:*

Яны пільна ахоўваюць нашы сады ад шкоднікаў.

3. Падкрэсліце галоўныя члены сказа.

*I варыянт:* Летам лісце пладовых і ягадных дрэў пакрываецца тлёй.

*II варыянт:* Гэтыя насякомыя высмоктваюць з лісця сокі.

## IV КЛАС

## Кантрольны дыктант з граматычным заданнем

**Гаспадар**

Паўлік прыехаў у госці да бабулі і дзядулі. Яны жывуць у горадзе. Паўлік хадзіў з дзедам у парк, у кіно. Хлопчык дапамагаў бабулі на кухні. Разам яны гатавалі суп, пірог.

Праз некалькі дзён Паўлік засумаваў. Як там дома? Хто курэй з градак прагоніць? Ці не забыў тата пакарміць карову? Можа, сабака Рэкс галодны? Дзядуля і бабуля ледзьве супакоілі ўнука. У нядзелю дзядуля адвёз Паўліка да бацькоў. (67 слоў)

*Паводле В. Ткачова*

Паведаміць пра пастаноўку коскі ў сказе *Можа, сабака Рэкс галодны?*

***Граматычнае заданне***

1. Знайдзіце ў сказе дзеяслоў, вызначце яго час, лік і род.

*I варыянт:* Паўлік прыехаў у госці да бабулі і дзядулі.

*II варыянт:* У нядзелю дзядуля адвёз Паўліка да бацькоў.

2. Разбярыце слова па саставе.

*I варыянт:* бабуля.

*II варыянт:* дзядуля.

3. Падкрэсліце галоўныя члены сказа.

*I варыянт:* У нядзелю дзядуля адвёз Паўліка да бацькоў.

*II варыянт:* Паўлік прыехаў у госці да бабулі і дзядулі.

**Задзіры**

Юраська сядзеў у пакоі і назіраў за вераб'ямі. Птушкі заўзята дзяўблі адна адну. Нават пер'е

ляцела ў розныя бакі. Што ж яны не падзялілі? Аказваецца, адзін верабей знайшоў хлебную скарынку. Другі верабей захацеў яе адабраць.

Хлопчык вырашыў дапамагчы птушкам, памірыць іх. Ён набраў жменю круп і сыпануў праз акно. Вераб'і разляцеліся, потым сышліся і дружна пачалі сілкавацца. Юраська ўважліва глядзеў на іх і радаваўся.(!) (65 слоў)

*Паводле В. Ткачова*

Запісаць на дошцы слова *знайшоў*.

Паведаміць пра пастаноўку коскі ў сказе *Аказваецца, адзін верабей знайшоў хлебную скарынку.*

***Граматычнае заданне***

1. Выпішыце з тэксту аднакаранёвыя словы да прапанаваных. Абазначце ў іх корань.

*I варыянт:* палёт.

*II варыянт:* рашэнне.

2. Вызначце лік, асобу і склон займенніка ў сказе.

*I варыянт:* Што ж яны не падзялілі?

*II варыянт:* Ён набраў жменю круп і сыпануў праз акно.

3. Падкрэсліце аднародныя члены сказа.

*I варыянт:* Юраська сядзеў у пакоі і назіраў за вераб'ямі.

*II варыянт:* Юраська ўважліва глядзеў на іх і радаваўся.

**Крапіва**

Чаму пячэцца крапіва? Расліны складаюцца з клетак. У крапівы сярод звычайных клетак тырчаць доўгія клеткі. Яны падобныя на валаскі. Праз мікраскоп можна ўбачыць, што валаскі нагадваюць бутэлечкі. Рыльца гэтай бутэлечкі заканчваецца закрытай галоўкай. Таму сок і не выцякае. Каля самай галоўкі сценкі гэтай бутэлькі вельмі тонкія. Пры дотыку яны адломваюцца. На месцы галоўкі застаецца вострае джала. Яно ўпіваецца ў цела і ўпырсквае ядавіты сок. (65 слоў)

*Па матэрыялах кнігі "Таямніцы Дзеда Усяведа"*

Паведаміць пра пастаноўку коскі ў сказе *Праз мікраскоп можна ўбачыць, што валаскі нагадваюць бутэлечкі.*

***Граматычнае заданне***

1. Падбярыце з тэксту антонімы да прапанаваных слоў.

*I варыянт:* адкрытай, нельга.

*II варыянт:* кароткія, тоўстыя.

2. Знайдзіце ў сказе назоўнікі, вызначце іх род, лік і склон.

*I варыянт:* Рыльца гэтай бутэлечкі заканчваецца закрытай галоўкай.

*II варыянт:* На месцы галоўкі застаецца вострае джала.

3. Падкрэсліце галоўныя члены сказа.

*I варыянт:* Чаму пячэцца крапіва?

*II варыянт:* Таму сок і не выцякае.

*ЛІТАРАТУРА*

Гурскі, В. Р. Кучараўчык : апавяданні : для малод. шк. узросту / В. Р. Гурскі. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2004. — 159 с.

Ліпскі, У. С. Сакрэты колераў вясёлкі : апавяданні, казкі, вершы / У. С. Ліпскі. — Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2014. — 120 с.

Таямніцы дзеда Усяведа : апавяданні, загадкі, вершы, задачкі / уклад. А. Левіціна. — Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2014. — 64 с.

Ткачоў, В. Ю. Незвычайны дыктант : апавяданні : для малод. шк. узросту / В. Ю. Ткачоў. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2004. — 47 с.

Ягоўдзік, У. І. Лясныя таямніцы : апавяданні і мініяцюры : для мал. і сярэд. шк. узросту / У. І. Ягоўдзік. — Мінск : Выдавец М. Ягоўдзік, 2014. — 160 с.

**Н. М. АНТАНОВІЧ,**
дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі БДПУ імя М. Танка, кандыдат педагагічных навук, дацэнт




**Беларуская мова**
Навучанне грамаце
Н. М. Антановіч







**Мова — наша спадчына**
Дадатковыя практыкаванні
3 клас. I паўгоддзе
3 клас. II паўгоддзе
Н. М. Антановіч




**Правілы беларускай мовы ў табліцах і схемах**
2—4 класы
Н. М. Антановіч